БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС



ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

**Сяргей НОВІКАЎ**

# Мінскае гета і Малы Трасцянец: новае даследаванне

*Увазе чытачоў прапануецца агляд новага даследавання нямецкага гісторыка Петры Рэнтрап "Месцы злачынстваў "канчатковага рашэння". Мінскае гета і месца знішчэння Малы Трасцянец", якое выйшла з друку ў Берліне ў канцы 2011 г.*

Аб прычынах, па якіх чарговую грунтоўную навуковую працу па вельмі важнай для беларускай грамадскасці тэме гісторыі Мінскага гета і Трасцянецкага лагера смерці мы атрымліваем не ад айчынных, а ад нямецкіх даследчыкаў, можна пісаць асобны артыкул. Не сакрэт, што на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў пасля вайны гэтая праблематыка заставалася па-за межамі грунтоўнага навуковага аналізу, паколькі трапіла ў сферу не столькі гісторыі, колькі ідэалогіі. Абмежаваны доступ да архіўных дакументаў, недахоп гістарычных крыніц у айчынных фондах, адсутнасць альтэрнатыўных падыходаў да ваеннай гісторыі ў значнай ступені паўплывалі на тое, што беларускія даследчыкі толькі ў апошні час пачалі актыўна распрацоўваць гэтую праблематыку[1], у тым ліку ў форме спецыяльнага дысертацыйнага даследавання[2]. Аднак зробленыя ў гэтым кірунку крокі пакуль што не завяршыліся стварэннем такой навуковай распрацоўкі па гісторыі Мінскага гета і Трасцянецкага лагера смерці, без якой немагчыма абысціся як прафесійным гісторыкам, так і зацікаўленым чытачам.

Нагадаем, што **Мінскае гета** было створана 19 ліпеня 1941 г. паводле распараджэння камендanta палявой камендатуры № 812 К.Шлегельхофера. На той момант у Мінску было каля 80 тыс. яўрэяў, да верасня—кастрычніка 1941 г. іх колькасць павялічылася да 100 тыс. чалавек. У лістападзе ў гета даставілі 6962 еўрапейскіх яўрэяў. Дакладная колькасць яўрэяў, прывезеных у Мінск з краін Заходняй Еўропы, не вызначана. У розных крыніцах прыводзяцца лічбы ад 25 тыс. да 80 тыс. чалавек. 7 лістапада, 20 лістапада 1941 г., 2 сакавіка, 28—31 ліпеня 1942 г. і ў кастрычніку 1943 г. у гета адбыліся вялікія пагромы[3].

**Трасцянецкі лагер смерці** быў створаны ў лістападзе 1941 г. каля в. Трасцянец Мінскага раёна для масавага знішчэння савецкіх грамадзян і ваеннапалонных, палітычных вязняў турмаў і лагераў, яўрэяў з Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі. Масавыя расстрэлы праводзіліся ва ўрочышчы Благаўшчына (да кастрычніка 1943 г. знішчана 150 тыс. чалавек), потым ва ўрочышчы Шашкоўка (знішчана больш за 50 тыс. чалавек), дзе была створана спецыяльная яма-печ. Дастаўленыя ў канцы чэрвеня



***НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.***
*Загадчык кафедры айчыннай гісторыі і сусветнай культуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці, у 1980 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004). З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць". Вып. 1—10 (Мн., 2002—2012).*

1944 г. вязні былі знішчаны ў калгасным хляве ў в. Малы Трасцянец (6,5 тыс. чалавек). Усяго ў Трасцянецкім лагеры смерці загублена 206,5 тыс. чалавек. Трасцянецкі лагер па колькасці знішчаных людзей стаіць на 4-м месцы пасля Асвенціма, Майданака і Трэблінкі[4].

У канцы 2011 г. у Берліне выйшла з друку даследаванне пад назвай **"Месцы злачынстваў "канчатковага рашэння". Мінскае гета і месца знішчэння Малы Трасцянец"**[5], аўтарам якога з'яўляецца Петра Рэнтрап — дактарантка Цэнтра па даследаванні антысемітызму Тэхнічнага ўніверсітэта Берліна. Выконвалася яно ў рамках праекта "Нацыянал-сацыялісцкія месцы знявалення і вынішчэння ў Беларусі: гісторыя Мінскага гета і лагера смерці Малы Трасцянец" пад кіраўніцтвам дырэктара даследчыцкага цэнтра прафесара Вольфганга Бенца. Новая кніга апублікавана ў рамках серыі "Дакументы—тэксты—матэрыялы", у якой да гэтага ўжо было выдадзена 79 прац, прысвечаных "нямецка-яўрэйскай гісторыі", праблемам даследавання антысемітызму і Халакосту.

У дадзеным артыкуле аўтар спрабуе пазнаёміць беларускіх даследчыкаў і чытачоў з новымі падыходамі да нацысцкіх злачынстваў у Мінскім гета і лагеры смерці Малы Трасцянец. На наш погляд, асобныя ацэнкі і некаторыя палажэнні, якія прыведзены ў новай працы, патрабуюць абгрунтаванага абмеркавання на сучасным узроўні навуковых ведаў.

Структура кнігі ўключае ўступ, 6 частак (падзеленых на 14 раздзелаў і 4 падраздзелы), заключэнне, спіс крыніц, літаратуры і асабістых імёнаў.

**У прадмове** да выдання (с. 7—15) даследчыца акрэслівае галоўныя напрамкі сваіх навуковых пошукаў адносна Мінска і яго ваколіц у структуры нацыянал-сацыялісцкага "канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання". Яна ставіць наступнае пытанне: *Якое месца было адведзена Мінску ў пачатку ўстанаўлення германскага акупацыйнага рэжыму і якую ролю ён павінен быў адыгрываць у працэсе масавага вынішчэння яўрэяў на акупаваных усходніх тэрыторыях?* П.Рэнтрап адзначае, што ўжо ў жніўні 1941 г. Мінск разглядаўся вышэйшым нацысцкім кіраўніцтвам як месца для стварэння аднаго з *"самых вялікіх лагераў смерці для еўрапейскіх яўрэяў"* (с. 8). Аднак першапачаткова гэтая роля адводзілася Магілёву. З пачаткам жа сістэматычнай дэпартацыі еўрапейскіх яўрэяў на ўсход (з кастрычніка 1941 г.) А.Гітлер вызначыў Мінск як месца для вырашэння пастаўленых задач у ходзе другой хвалі дэпартацыі. На гэта паўплываў і той факт, што ўзімку 1941/1942 г. сітуацыя на савецка-германскім фронце значна змянілася.

Даследчыца падкрэслівае, што разглядае гісторыю вынішчэння яўрэяў у Мінску і яго ваколіцах у кантэксце, з аднаго боку, патрабаванняў вышэйшага нацысцкага кіраўніцтва, а з другога — з улікам намераў функцыянераў цывільнай адміністрацыі, СС і паліцыі як рэгіянальнага, так і лакальнага ўзроўняў. Яна паказвае, наколькі супярэчлівыя былі адносіны ў справе "канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання" паміж цывільнай уладай на чале з гаўляйтарам В.Кубэ і паліцэйскімі службамі, службамі бяспекі.

Праца напісана на аснове не толькі новых гістарыяграфічных крыніц, але і малавядомых дакументаў, выяўленых у шэрагу архіўных фондаў, у тым ліку: Федэральных архівах у Берліне, Кобленцы, Людвігсбургу; дзяржаўных архівах Гамбурга і Мюнстэра; архіве Інстытута сучаснай гісторыі ў Мюнхене; галоўным зямельным архіве ў Кобленцы; зямельных архівах у Берліне і Карлсруэ; архіве дакументаў аўстрыйскага Супраціўлення ў Вене, дакументальным цэнтры Сімона Візэнталя ў Вене, архіве зямельнага суда Вены; дзяржаўным архіве Мінскай вобласці, Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны; фондах яўрэйскага музея ў Празе, архіве Мемарыяльнага музея Халакосту ў ЗША; фондах архіва відэаматэрыялаў Свабоднага ўніверсітэта Берліна, Цэнтра па даследаванні антысемітызму Тэхнічнага ўніверсітэта Берліна.

Для правядзення дэталёвай рэканструкцыі працэсу вынішчэння яўрэяў у Мінскім гета і Малым Трасцянцы П.Рэнтрап звярталася да матэрыялаў судовых органаў Германіі, Аўстрыі і СССР. Пры гэтым яна адзначае, што судовыя справы і матэрыялы да іх, якія створаны ў рамках дзейнасці Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі СССР па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, маюць "моцную ідэалагічную афарбоўку", таму не заўсёды могуць быць выкарыстаны даследчыкамі (с. 14).

Да ліку важных крыніц па гісторыі Мінскага гета і Малога Трасцянца адносяцца ўспаміны былых вязняў. Надзвычайную каштоўнасць пры гэтым маюць дзённікавыя запісы, пакінутыя вязнем Мінскага гета Бертольдам Руднерам, нямецкім яўрэем аўстрыйскага паходжання. Гэтыя запісы ацэньваюцца сучаснай германскай гістарыяграфіяй як дакумент "вышэйшага ўзроўню", паколькі практычна ўпершыню па днях адлюстроўваюць падзеі ў Мінскім гета ў перыяд з 18 лістапада 1941 г. па 3 чэрвеня 1942 г.

Адзначаючы грунтоўны падыход даследчыцы да выкарыстання новай дакументальнай базы, неабходна звярнуць увагу на недастатковы аналіз ёю беларускай гістарыяграфіі па праблеме. Са спіса крыніц і літаратуры бачна, што для напісання працы выкарыстаны нямецкія выданні па 2009 г. уключна, тады як беларускія — па 2008 г. Пры гэтым у бібліяграфічны пералік не ўключана адно з найважнейшых дакументальных выданняў (Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. Мн., 2003), даследчыца не згадвае дысертацыйнае даследаванне С.М.Тукалы па гісторыі генацыду і барацьбы ў Мінскім гета ў 1941—1943 гг. (Мн., 2008), не выкарыстоўвае рускамоўнае выданне магістарскай работы нямецкай даследчыцы К.Хэкер аб нямецкіх яўрэях у Мінскім гета (Мн., 2007). Акрамя таго, П.Рэнтрап абыходзіць маўчаннем той факт, што дзённік вязня Мінскага гета Б.Руднера быў упершыню апублікаваны Гістарычнай майстэрняй у Мінску ў 2005 г.[6].

Першая частка кнігі мае назву **"Нацысцкая "яўрэйская палітыка" да 1939/40 гг."** (с. 17—37). У ёй даследчыца прыходзіць да высновы, што пачынаючы з яўрэйскага пагрому ў Берліне ў лістападзе 1938 г. планы нацысцкага кіраўніцтва па "вырашэнні яўрэйскага пытання" паступова набывалі ўсё больш радыкальны характар. Праз зусім кароткі час пасля нападу Германіі на Польшчу 1 верасня 1939 г. было прынята рашэнне аб першай дэпартацыі яўрэяў. У наступныя два гады абмяркоўваліся розныя варыянты яго рэалізацыі.

Першыя яўрэйскія дэпартацыі былі часткова рэалізаваны ўжо ў пачатку снежня 1939 г., калі да 17 снежня на тэрыторыю польскага Генерал-губернатарства (на малапрыдатныя землі на р. Сан) былі дэпартаваны амаль 88 тыс. чалавек. Фактычна гэта быў скрыты генацыд: нацысцкі рэжым разлічваў на тое, што частка дэпартаваных не вытрымае дрэнных умоў пражывання і памрэ.

Летам 1940 г. быў распрацаваны новы праект над назвай "план Мадагаскар". У адпаведнасці з ім прадугледжвалася выгнанне 4 млн еўрапейскіх яўрэяў на французскі каланіяльны востраў, клімат якога стаў бы важным фактарам вынішчэння яўрэяў. Даследчыца П.Рэнтрап падтрымлівае думку нямецкага гісторыка В.Бенца аб тым, што ўзнікненне такога плана азначала пераход ад ідэі *выгнання яўрэяў* да ідэі *іх поўнага вынішчэння* (с. 36). Аднак рэалізаваць гэты план не ўдалося, паколькі галоўнай умовай для яго правядзення павінна была стаць ваенная перамога над Вялікабрытаніяй. А сітуацыя, якая складвалася ў Еўропе пасля паражэння Францыі, давала Гітлеру падставу для падрыхтоўкі ваеннай аперацыі на ўсходзе.

У другой частцы працы **"Аперацыя "Барбароса" і "яўрэйскае пытанне"** (с. 39—55) ідзе размова аб характары запланаванага процістаяння "нацыянал-сацыялісцкай Германіі" і "бальшавіцкага Савецкага Саюза". А.Гітлер не раз казаў, што вайна супраць СССР павінна насіць радыкальны характар, які будзе вызначацца не столькі барацьбой зброі на палях бітваў, колькі супрацьстаяннем двух розных светапоглядаў (с. 41). З распрацоўкай плана "Барбароса" нацысцкае кіраўніцтва пачало разглядаць тэрыторыю Савецкага Саюза таксама ў якасці вобласці "дэпартацыі яўрэяў". Зноў узнікла ідэя сканцэнтраваць еўрапейскіх яўрэяў у аддаленых месцах, дзе не было б належных умоў для жыцця. Новымі пры гэтым сталі думкі аб прыцягненні іх да цяжкай працы, каб яны выміралі натуральным шляхам з-за невыносных умоў. Узнікалі ідэі і аб тым, каб забіраць прадукцыю сельскай гаспадаркі з вялікай тэрыторыі СССР і накіроўваць яе на патрэбы вермахта і насельніцтва Трэцяга рэйха. Вынікам такой рабаўнічай палітыкі павінна было стаць выміранне мільёнаў савецкіх людзей. Гэтыя планы насілі і пэўныя рысы антысемітызму, паколькі мелі на мэце вынішчэнне насельніцтва вялікіх гарадоў заходняй часткі СССР, дзе гістарычна пражывала значная колькасць яўрэяў. Па выказваннях міністра па занятых усходніх тэрыторыях А.Розенберга, Беларусь разглядалася як "другі яўрэйскі рэзервуар" пасля польскага Генерал-губернатарства. З'явіліся нават думкі аб перасяленні яўрэяў на поўдзень Беларусі, каб выкарыстаць іх працу для асушэння Прыпяцкіх балот (с. 51). Аналізуючы розныя планы нацысцкага кіраўніцтва, П.Рэнтрап падтрымлівае тэзіс нямецкага гісторыка К.Герлаха аб тым, што адзінай мэтай запланаванай дэпартацыі яўрэйскага насельніцтва на ўсход павінна было стаць яго значнае скарачэнне (с. 53).

У трэцяй частцы даследавання **"Пачатак праследавання яўрэяў у Мінску"** (с. 57—98) на прыкладзе Мінска паказаны ход правядзення "вайны на вынішчэнне". Пасля захопу ў канцы чэрвеня 1941 г. германскімі войскамі горад знаходзіўся ў сферы дзейнасці розных службаў ваеннай адміністрацыі, у тым ліку кіраўніцтва вышэйшага начальніка СС і паліцыі, обергрупенфюрэра СС Э. фон Бах-Залеўскага. Даследчыца паказвае, што пытанні правядзення "яўрэйскай палітыкі" знаходзіліся ў цэнтры ўвагі не толькі айнзацгрупы Б і яе зондэркаманд 7а і 7б, але і вайсковага камандавання. У працы сцвярджаецца, што вайсковае камандаванне дзейнічала ў Мінску без спецыяльных загадаў зверху. Сведчаннем таму з'яўляецца факт арганізацыі Мінскага гета па загаду ваеннай палявой камендатуры № 812 ад 19 ліпеня 1941 г. Вызначаючы колькасць яўрэяў, якія апынуліся ў гета, П.Рэнтрап лічыць, што яна не перавышала 60 тыс. чалавек (с. 65).

Заўважым, што ў пачатку гэтай часткі кнігі даследчыца прыводзіць лічбы адносна колькасці яўрэяў, якія пражывалі ў Мінску на пачатак вайны. Яна робіць падлікі на падставе агульнай колькасці жыхароў горада (240 тыс. чалавек), амаль трэць ад якіх (70 998 чалавек) складалі яўрэі (с. 58). Пры гэтым прыведзеныя падлікі грунтуюцца на статыстычных даных на 1939 г., тады як у студзені 1941 г. у Мінску пражывала амаль 300 тыс. чалавек[7].

Аналіз новых фактаў аб вынішчэнні яўрэяў з моманту захопу Мінска пераконвае ў тым, што масавыя забойствы мірных жыхароў яўрэйскага паходжання пачаліся з першых дзён акупацыі горада. Так, ужо праз тыдзень была праведзена адна з першых "яўрэйскіх акцый", вынікам якой стала забойства ад 50 да 70 яўрэйскіх мужчын (с. 66). Дакументы сведчаць, што інфармацыю аб правядзенні такой акцыі чакала вышэйшае кіраўніцтва Галоўнага ведамства Імперскай бяспекі рэйха і ў першую чаргу яго начальнік Р.Гейдрых. Пад уплывам яго спецыяльных "часцей па вядзенні вайны светапоглядаў" у акупаваным горадзе пачаліся акцыі па выяўленні сярод цывільнага насельніцтва і ваеннапалонных падазроных асоб і асоб яўрэйскага паходжання, якія падлягалі неадкладнаму знішчэнню. П.Рэнтрап піша, што яўрэі сталі фактычна першымі ахвярамі ў лагеры Дразды пад Мінскам, дзе да 10 ліпеня былі ліквідаваны 1050 яўрэяў (с. 72). Частка яўрэяў, выяўленых у лагеры Дразды, пазней была пераведзена ў гарадскую турму на вуліцы Валадарскага.

Новым словам у даследаванні з'яўляюцца сцвярджэнні аб тым, што ізаляцыя мінскіх яўрэяў у рамках

гета пачалася з 10 ліпеня (а не 19 ліпеня, як прынята ў гістарыяграфіі) пры ўзаемадзеянні ваенных служ-баў і падраздзяленняў айнзацгрупы Б. Падрыхтоў-чыя работы ўжо праводзіліся, калі супраць яўрэяў былі праведзены мерапрыемствы на тэрыторыі лаге-ра Дразды. Прычыну гэтага П.Рэнтрап бачыць у тым, што ў пачатку германскай акупацыі савецкай тэры-торыі падраздзяленні СС і паліцыі вынішчалі ў пер-шую чаргу ваеннаабавязаных яўрэйскіх мужчын і пакідалі іншае яўрэйскае насельніцтва. З боку ваен-най адміністрацыі за правядзенне "яўрэйскай палі-тыкі" адказваў адпаведны аддзел вайсковай паля-вой камендатуры, на чале якой стаяў падпалкоўнік К.Шлегельхофер. Яго падраздзяленні павінны былі выконваць распараджэнні камандуючага тылам гру-пы армій "Цэнтр" генерала М. фон Шэнкендорфа, які з 7 па 24 ліпеня 1941 г. выдаў некалькі распараджэн-няў аб татальным праследаванні яўрэяў на тэрыторыі Беларусі, занятай войскамі вермахта.

У адпаведнасці з распараджэннем ад 7 ліпеня 1941 г. уводзіліся знакі адрознення для яўрэяў, ста-рэйшых за 10 гадоў. Яны павінны былі насіць альбо белую палоску з жоўтай зоркай на рукаве, альбо вялі-кую жоўтую латку на грудзях. Палявая камендатура ў Мінску выдала адпаведнае распараджэнне тыднем пазней і запатрабавала, каб 10-сантыметровыя жоў-тыя латкі насіліся як на грудзях, так і на спіне. З даку-ментаў вынікае, што важнейшым момантам на этапе арганізацыі гета можна лічыць стварэнне юдэнрата (яўрэйскага савета). Такое распараджэнне было вы-дадзена М. фон Шэнкендорфам 13 ліпеня 1941 г. Аднак у Мінску гэта было зроблена па ініцыятыве вайсковай адміністрацыі на тры дні раней. З даку-ментаў, на якія спасылаецца нямецкая даследчыца, вынікае, што фарміраванне першага складу юдэн-рата было адвольнае, але адбывалася пры ўдзеле каменданта К.Шлегельхофера (с. 77).

Цэнтр Мінскага гета быў на Юбілейнай плошчы, дзе ў двухпавярховым будынку размяшчаўся юдэн-рат. У суседнім аднапавярховым драўляным будын-ку знаходзілася біржа працы. У памяшканні былога склада была адкрыта часовая турма (с. 81). Павод-ле загада каменданта, юдэнрат адказваў за перася-ленне яўрэяў з розных раёнаў горада на тэрыторыю яўрэйскага "жылога раёна". П.Рэнтрап піша, што вы-яўленыя на цяперашні час дакументы сведчаць: Мін-скае гета было першым на акупаванай тэрыторыі Беларусі (с. 83). Між тым, яна адзначае, што пакуль не існуе вычарпальнага адказу на пытанне аб маты-вах, па якіх вайсковая палявая камендатура пайшла на стварэнне ў Мінску гета.

Даследчыца спрабуе па-новаму асэнсаваць пры-чыны знаходжання рэйхсфюрэра СС Г.Гімлера ра-зам з іншымі высокапастаўленымі асобамі ў Мінску летам 1941 г. Галоўнае ведамства Імперскай бяс-пекі Гімлера вяло актыўны пошук адэкватнай моман-ту мадэлі "канчатковага рашэння" яўрэйскага пы-тання ў форме татальнага генацыду яўрэяў. Зыход-ным момантам гэтай канцэпцыі бачылася ідэя аб тым, што еўрапейскія яўрэі павінны быць вывезены ва Усходнюю Еўропу і там знішчаны ў спецыяльных цэнтрах. Увосень 1941 г. узніклі планы па стварэнні такіх цэнтраў (лагераў смерці) на тэрыторыі Поль-шчы, а таксама ў Рызе і Магілёве. Гітлер вызначыў сярэдзіну верасня часам масавай дэпартацыі яўрэ-яў з Германіі. Паколькі на той момант лагеры яшчэ не былі падрыхтаваны, кіраўніцтва СС вяло пошук прамежкавага рашэння праблемы.

Так, было прынята рашэнне аб дэпартацыі 25 тыс. яўрэяў у Мінск, які знаходзіўся не так далёка ад за-праектаванага цэнтра вынішчэння ў Магілёве. Аўтар адзначае, што для стварэння такога цэнтра ў Магі-лёве планавалася выкарыстаць тэрыторыю метала-апрацоўчага завода імя Г.Дзімітрова, дзе павінны



*Помнік вязням Мінскага гета.*
Устаноўлены ў 2008 г. з нагоды 65-й гадавіны ліквідацыі гета.

былі стацыянарна размясціць 32 крэмацыйныя печы для спальвання штодзённа да 3 тыс. трупаў. Эрфурцкая фірма "Топф і Зонэ" нават атрымала заданне выканаць гэты заказ. У канцы 1941 г. у Магілёў былі дастаўлены 4 печы, якія размясцілі на месцы прызначэння. Аднак падзеі на савецка-германскім фронце ўнеслі істотныя змены ў гэты план, і астатнія крэмацыйныя печы былі адпраўлены ў Асвенцім (с. 97). На тэрыторыі ж Мінскага гета адбыліся зачысткі, падчас якіх толькі ў лістападзе 1941 г. былі знішчаны ад 12 да 14 тыс. вязняў.

У выніку дастаўкі 11 лістапада першых эшалонаў з нямецкімі яўрэямі ў Мінскім гета ўзніклі два *зондэргета*, дзе размясціліся яўрэі, дэпартаваныя з Гамбурга, Дзюсельдорфа, Франкфурта-на-Майне, Берліна, Бруна, Брэмена і Вены. Пасля гэтага працэс дэпартацыі быў часова спынены з-за таго, што ўвесь наяўны транспарт працаваў на забеспячэнне бітвы пад Масквой. Аднак ужо ў 1942 г. Мінск быў зноў вызначаны ў якасці месца дэпартацыі.

Камандзір паліцыі бяспекі і СС Э.Штраўх шукаў у ваколіцах горада новае месца для знішчэння яўрэяў. Яно знайшлося непадалёк ад магілёўскай шашы — у 11 км ад Мінска каля вёскі Малы Трасцянец. У красавіку 1942 г. у гэтай вёсцы для соцень яўрэйскіх вязняў быў арганізаваны працоўны лагер. У шматлікіх даследаваннях гэты лагер называецца лагерам смерці. На думку ж нямецкай даследчыцы, *Малы Трасцянец займаў прамежкавае становішча паміж месцам масавага знішчэння і лагерам смерці.*

Шмат што пацвярджае факт радыкалізацыі забойстваў паліцыяй бяспекі і СД у Мінску. Так, са жніўня 1942 г. непадалёк ад гаспадаркі Штраўха, у Малым Трасцянцы, была абсталявана часовая чыгуначная платформа. Для нямецкай даследчыцы бясспрэчнай з'яўляецца думка пра тое, што пастаўлены на паток працэс масавых забойстваў еўрапейскіх яўрэяў пад Мінскам бярэ свой пачатак толькі ў першай палове 1942 г. Увесь папярэдні перыяд аўтар прапануе разглядаць у якасці асобнай фазы пераходу ад "яўрэйскай палітыкі" да "канчатковага рашэння яўрэйскага пытання". Мінск у гэтым працэсе стаў важнай арэнай для правядзення эксперыменту (с. 98).

У чацвёртай частцы **"Мінскае гета паміж "яўрэйскай палітыкай" і канчатковым вынішчэннем (1941—1943)"** (с. 99—158) аўтар падрабязна аналізуе ўмовы арганізацыі, існавання і ліквідацыі Мінскага гета, звяртае ўвагу на паўсядзённае жыццё вязняў гета. Так, гаворачы аб нямецкіх цывільных і паліцэйскіх службах, службе бяспекі, якія знаходзіліся ў Мінску як сталіцы Генеральнай акругі Беларусь, даследчыца паказвае вертыкальную і гарызантальную структуры гэтых службаў і выяўляе кола іх абавязкаў. У аснову правядзення "яўрэйскай палітыкі" з канца ліпеня 1941 г. былі пакладзены "Часовыя дырэктывы па абыходжанні з яўрэямі на тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд". З іх вынікалі паўнамоцтвы генеральнага і акружных камісарыятаў адносна вызначэння, рэгістрацыі, канцэнтрацыі і пазбаўлення ўласнасці яўрэяў у Остландзе. Аўтар адзначае, што ў сваіх дырэктывах рэйхскамісар Остланда Г.Лозэ імкнуўся да вырашэння "яўрэйскага пытання" на ўзор польскага Генерал-губернатарства. 18 жніўня 1941 г. былі выдадзены новыя дырэктывы па абыходжанні з яўрэямі ў Рэйхскамісарыяце Остланд, а 25 жніўня на іх аснове выйшлі інструкцыі аб выдаленні яўрэяў з любых грамадскіх установ і ўвядзенні для вязняў гета самых нізкіх прадуктовых норм (с. 109).

Для аховы гета магла прыцягвацца дапаможная паліцыя з мясцовага насельніцтва. У Мінску гэта былі 46-ы, 47-ы і 48-ы ўкраінскія ахоўныя батальёны, а таксама літоўскія і латышскія дапаможныя сілы з айнзацгруп. Першым камендантам Мінскага гета хутчэй за ўсё быў Аляксей Гарадзецкі — паліцэйскі аднаго з ахоўных батальёнаў. З канца 1941 г. за гета адказваў камандзір паліцыі бяспекі і СД у Мінску. Са снежня камендантам верагодней за ўсё з'яўляўся гаўптштурмфюрэр СС Ф.Старк. У 1942 г. ахову каменданта Мінскага гета складалі каля 100 чалавек службы бяспекі (СД), а таксама ад 40 да 50 літоўскіх і латышскіх паліцэйскіх. На чале іх стаяў гаўптвахмістр О.Гатэнбах. У лютым—сакавіку 1943 г. камендантам гета быў гаўптшарфюрэр СС А.Рубэ (с. 113).

Гаворачы аб колькасці яўрэяў у Мінскім гета, нямецкая даследчыца адзначае, што ў сучаснай гістарыяграфіі лічбы значна розняцца — ад 30 тыс. да 100 тыс. чалавек. П.Рэнтрап бярэ ў якасці зыходнай лічбу, пазначаную ў працы былога вязня гета Г.Смоляра. У пачатку 1960-х гг. у сваёй першай публікацыі "Насельніцтва Мінскага гета ў барацьбе супраць нямецкіх захопнікаў" ён назваў лічбу ў амаль 55 тыс. чалавек[8]. Даследчыца звяртае ўвагу на тое, што ў яго ж далейшых публікацыях гэтая лічба па незразумелых прычынах павялічылася да 80 тыс. чалавек (с. 113). Яна піша, што на рубяжы 1941—1942 гг. агульная колькасць вязняў гета складала ад 30 тыс. да 35 тыс. беларускіх яўрэяў і каля 7 тыс. еўрапейскіх яўрэяў. Такая выснова зроблена ёю на падставе даных, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (с. 114).

Раскрываючы ўмовы знаходжання яўрэяў у Мінскім гета, П.Рэнтрап паказвае, як яны выжывалі ў поўнай ізаляцыі, пры фактычнай адсутнасці харчавання і абмежаванай медыцынскай дапамозе. Калі неяўрэйскаму насельніцтву на тыдзень на аднаго чалавека прадугледжвалася 1750 г хлеба, 200 г мукі, 150 г круп, 200 г мяса, 60 г тлушчу і бульбы па меры неабходнасці, то для яўрэяў гэтыя нормы былі зменшаны да 875 г хлеба, 100 г мукі і 75 г круп. Мяса, тлушч і бульба для яўрэяў не прадугледжваліся (с. 118). Нейкі шанс на атрыманне невялікага харчовага рацыёну давала толькі праца на нямецкіх прадпрыемствах. У такіх умовах на тэрыторыі гета панавалі розныя захворванні, здараліся эпідэміі. Вязні маглі разлічваць толькі на дапамогу дактароў з мясцовага яўрэйскага медыцынскага персаналу.

Да ліку антысеміцкіх мерапрыемстваў акупацыйныя ўлады адносілі і працоўны абавязак для яўрэяў. У сярэдзіне ліпеня 1941 г. кіраўніцтва юдэнрата ат-

рымала ўказанні падрыхтаваць працоўныя групы з мужчын і жанчын ва ўзросце ад 15 да 55 гадоў для работ у разбураным горадзе. 24 ліпеня 1941 г. распараджэннем камандуючага тылам групы армій "Цэнтр" былі ўведзены новыя ўзроставыя рамкі для яўрэяў: для мужчын — ад 14 да 60 гадоў; для жанчын — ад 16 да 50 гадоў.

У канцы кастрычніка 1941 г. гарадскі камісарыят прыняў "Распараджэнне аб выкарыстанні яўрэяў на работах", у адпаведнасці з якім вызначалася, што гэтым пытаннем цалкам павінна займацца біржа працы. З 1 лістапада працуючыя яўрэі маглі атрымліваць заработную плату, праўда, з абмежаваннямі. Так, яўрэйскія рамеснікі і спецыялісты атрымлівалі значна меншы заробак, чым прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей, прычым 20% ад сумы павінны былі пералічвацца на спецыяльны рахунак. У выніку розных адлічэнняў яўрэйскія рабочыя атрымлівалі наяўнымі грашыма толькі 30% ад агульнай зарплаты. Кожны некваліфікаваны рабочы-яўрэй штодня павінен быў пералічваць у касу горада і фонд гарадскога будаўніцтва суму, роўную 1,6 рэйхсмаркі (с. 128).

Запыты на працоўную яўрэйскую сілу былі даволі значныя, паколькі ў горадзе адчуваўся недахоп працоўных рук. З восені 1941 г. беларускія і нямецкія яўрэі з Мінскага гета працавалі на былой фабрыцы "Кастрычнік", фірмах "Трэвіц", "Бендкоўскі", ва універмагу "Троль і Ко", у рамонтных майстэрнях люфтвафэ, на радыёзаводзе, на ўзвядзенні рамонтных майстэрняў "Верлін-Вэрк", розных будаўнічых пляцоўках арганізацыі Тодта і іншых аб'ектах. Працавалі яўрэі і ў рэдакцыі "Мінскай газеты", і ў бібліятэцы Мінскай акругі (с. 129). З лета 1943 г. у сувязі з прыняццем рашэння аб ліквідацыі гета прадугледжваўся перавод працуючых яўрэяў у канцэнтрацыйныя лагеры. Гэта азначала, што ўсё астатнія вязні гета падлягалі вынішчэнню (с. 133).

Маёмасць і ўласныя рэчы вязняў Мінскага гета канфіскоўваліся. Многія ўласныя рэчы мінскіх і еўрапейскіх яўрэяў апынуліся на спецыяльным уліку яўрэйскай маёмасці і захоўваліся ў вялізным складзе на тэрыторыі опернага тэатра. Яўрэі з гета павінны былі весці пастаянны ўлік паступаючых яўрэйскіх рэчаў (вопраткі, тэкстыльных і скураных вырабаў і г.д.), якія потым набывалі розныя службы, установы і прыватныя асобы. Нямецкая даследчыца падкрэслівае факт недаследаванасці гэтай праблемы, асабліва з улікам паўторнага выкарыстання уласных рэчаў яўрэяў (с. 138).

Адным з важных пытанняў, якое грунтоўна даследуе П.Рэнтрап, з'яўляюцца колькасныя падлікі яўрэяў, якія сталі ахвярамі аблаў на тэрыторыі Мінскага гета, што праводзіліся з лістапада 1941 г. па кастрычнік 1943 г. Даследчыца адзначае, што ў параўнанні з гета на тэрыторыі Польшчы вынішчэнне яўрэяў на акупаванай савецкай тэрыторыі з самага пачатку характарызавалася сістэматычнасцю. У Мінскім гета СС і паліцыя правялі шэраг вялікіх аперацый і значную колькасць аблаў (дакладную лічбу назваць немагчыма).

Дакументы сведчаць, што 14 жніўня 1941 г., практычна адразу пасля часу закрыцця граніц гета, адбылася першая аблава, ахвярамі якой сталі не менш за 100 мужчын. Яны былі спачатку дастаўлены ў мінскую турму, а на другі дзень расстраляны айнзацкамандай 8 за межамі горада ў прысутнасці рэйхсфюрэра СС Г.Гімлера. У канцы месяца адбыліся дзве вялікія аблавы, падчас якіх былі схоплены больш за 2 тыс. чалавек, у тым ліку жанчын. У данясенні айнзацкаманды 8 ад 1 верасня значыцца, што за межамі горада ў гэты дзень былі расстраляны 2278 яўрэяў (с. 139).

З лістапада 1941 г. на тэрыторыі гета пачаліся пагромы, ахвярамі якіх станавіліся жанчыны, дзеці, людзі сталага ўзросту і фізічна слабыя асобы. Гэтыя пагромы адрозніваліся ад аблавы, праведзенай у жніўні, ахвярамі якой былі мужчыны, у першую чаргу ваеннаабавязанага ўзросту. На думку нямецкай даследчыцы, рашэнне аб правядзенні лістападаўскай "вялікай акцыі" не было ініцыятывай мясцовага кіраўніцтва, а адпавядала планам па дэпартацыі ў Мінск 25 тыс. еўрапейскіх яўрэяў. Паводле даных СС і паліцыі, якія прымалі ўдзел у правядзенні гэтай акцыі, усяго ва ўрочышчы Тучынкі (на поўнач ад Мінска) былі ліквідаваны 6624 яўрэі з Мінскага гета. Акцыя па ліквідацыі доўжылася некалькі дзён і завяршылася 11 лістапада 1941 г. (с. 141).

Даследчыца надае ўвагу асноўным этапам вынішчэння яўрэяў Мінскага гета ў ходзе аблаў і пагромаў, раскрываючы іх маштабы на прыкладзе правядзення "вялікіх акцый" 2—3 сакавіка 1942 г., 28—29 ліпеня 1942 г. і 21—23 кастрычніка 1943 г. Летам 1942 г. пачалася ліквідацыя еўрапейскіх яўрэяў з Берліна, Бруна, Брэмена і Вены (с. 148). Яны былі вывезены з Мінска ва ўрочышча Благаўшчына ў раёне Малога Трасцянца, дзе расстраляны каля спецыяльна выкапаных ям вялікіх памераў. Так, 28 ліпеня 1942 г. былі знішчаны 6 тыс. мясцовых яўрэяў, на другі дзень — 3 тыс. еўрапейскіх яўрэяў. 31 ліпеня 1942 г. генеральны камісар В.Кубэ паведамляў рэйхскамісару Г.Лозэ пра тое, што на працягу двух дзён 28 і 29 ліпеня былі ліквідаваны каля 10 тыс. яўрэяў з Мінскага гета, пераважна людзі сталага ўзросту, жанчыны і дзеці (с. 149). З 1 верасня 1943 г. у Мінску пачалася ліквідацыя гета. Канчаткова яно было ліквідавана на працягу 21—23 кастрычніка, калі ў Благаўшчыну былі вывезены і ліквідаваны больш за 1 тыс. яўрэяў (с. 152).

Чытаючы гэтую частку кнігі, нельга не заўважыць, што нямецкая даследчыца пакідае адкрытым пытанне аб агульнай колькасці вязняў Мінскага гета, ліквідаваных у ходзе пагромаў і аблаў, праведзеных СС і паліцыяй са жніўня 1941 г. па кастрычнік 1943 г. Гэта азначае, што канчатковыя падлікі пакуль адсутнічаюць.

У пятай частцы працы **"Нямецкія яўрэі ў Мінскім гета"** (с. 159—184) расказваецца пра лёс еўрапейскіх яўрэяў, дэпартаваных у Мінск на працягу 1941—1942 гг. Адпаведна прапанове, выказанай Г.Гейдрыхам у Празе 10 кастрычніка 1941 г., у Мінск

і Рыгу павінны былі дэпартаваць 50 тыс. еўрапейскіх яўрэяў, прычым у Мінск — палову з іх. Першапачаткова планавалася завяршыць дэпартацыю ў пачатку 1942 г. У рэальнасці жа да канца 1941 г. з Германіі і Аўстрыі былі адпраўлены 7 чыгуначных саставаў, якія даставілі ў Мінск 6937 яўрэяў з Гамбурга, Дзюсельдорфа, Франкфурта-на-Майне, Берліна, Бруна, Гамбурга/Брэмена і Вены. Першы састаў прыбыў у Мінск 11 лістапада 1941 г.

Распавядаючы аб "зондэргета", даследчыца адзначае, што нямецкія яўрэі пасля прыбыцця ў Мінскае гета ўбачылі сляды жахлівых забойстваў: з 6 па 11 лістапада 1941 г. СС і паліцыя ліквідавалі больш за 6 тыс. беларускіх яўрэяў, каб вызваліць месца для размяшчэння нямецкіх яўрэяў. Ім было загадана размясціцца ў вялікім будынку з чырвонай цэглы. У "чырвоным доме" пачалася гісторыя "зондэргета 1": да канца лістапада 1941 г. у ім былі размешчаны па вуліцах Сухая, Абутковая, Шорная і Рэспубліканская яўрэі з Гамбурга, Дзюсельдорфа і Франкфурта-на-Майне. У "зондэргета 2" уваходзілі вуліцы Замкавая і Астроўскага. Тут размясцілі яўрэяў з Берліна, Бруна, Гамбурга/Брэмена і Вены (с. 178). Нямецкая даследчыца падкрэслівае, што еўрапейскія яўрэі, як і беларускія, выкарыстоўваліся ў гаспадарцы камандзіра паліцыі бяспекі і СД у Малым Трасцянцы. З агульнай колькасці еўрапейскіх яўрэяў, якія былі дэпартаваны ў Мінск у 1941 г., жывымі засталіся толькі каля 50 яўрэяў (с. 184).

У шостай частцы кнігі "**Малы Трасцянец (1942—1944)**" (с. 185—227) даследчыца спрабуе рэканструяваць карціну стварэння, існавання і ліквідацыі Малога Трасцянца, вядомага ў айчыннай гістарычнай літаратуры пад назвай "Трасцянецкі лагер смерці". П.Рэнтрап прапануе карыстацца ў навуковым ужытку наступнымі тэрмінамі: працоўны лагер Малы Трасцянец і месцы вынішчэння ў раёне Малога Трасцянца (Шашкоўка, Благаўшчына, хлеў). Паводле прынятага ў беларускай гістарычнай навуцы падыходу, з восені 1941 г. у Благаўшчыне вяліся расстрэлы пераважна неяўрэйскага насельніцтва Беларусі і савецкіх ваеннапалонных. Сваё абвяржэнне гэтага меркавання П.Рэнтрап абгрунтоўвае адсутнасцю дастатковых дакументальных пацвярджэнняў. Факт стварэння і функцыянавання з восені 1941 г. Трасцянецкага лагера смерці не пацвярджаецца, таму што ў гэты час назіралася неўкамплектаванасць штата мінскай паліцыі бяспекі, прамым абавязкам якой з'яўлялася правядзенне такіх злачынных мерапрыемстваў за межамі тэрыторыі горада (с. 185). Гаворачы пра Малы Трасцянец, даследчыца прапануе вызначаць пад гэтай дэфініцыяй працоўны лагер, створаны каля вёскі Малы Трасцянец вясной 1942 г.

Наяўныя дакументальныя крыніцы сведчаць, што працоўны лагер Малы Трасцянец узнік у канцы красавіка 1942 г. (с. 186). 11 мая ва ўрочышчы Благаўшчына мінскай паліцыяй бяспекі і СД разам з мясцовымі памагатымі быў праведзены першы расстрэл каля 1 тыс. венскіх яўрэяў. Гэта азначала, што была прадоўжана справа па дэпартацыі еўрапейскіх яўрэяў у Мінскае гета, якая часова прыпынілася ў канцы лістапада 1941 г. З мая прадстаўнікі паліцыі бяспекі і СД рэгулярна праводзілі расстрэлы дэпартаваных еўрапейскіх яўрэяў. Новай з'яўляецца думка даследчыцы пра тое, што менавіта дэпартацыя яўрэяў у напрамку Мінска з'яўлялася вызначальнай умовай для стварэння Малога Трасцянца.

Першапачатковы намер аб стварэнні лагера смерці ў раёне Магілёва быў згорнуты ў сувязі з пярэчаннямі з боку кіраўніка тылу групы армій "Цэнтр" М. фон Шэнкендорфа (с. 186). У той жа час Галоўнае ведамства Імперскай бяспекі ў Рэйху пакінула ў сваіх планах Мінск як адно з месцаў дэпартацыі еўрапейскіх яўрэяў на ўсход. Ужо ў пачатку 1942 г. у горадзе пайшлі чуткі аб аднаўленні планаў па дэпартацыі яўрэяў. 5 студзеня гарадскі камісар Янэцке наведаў Мінскае гета, пасля чаго праз В.Кубэ і Г.Лозэ накіраваў ва Усходняе міністэрства пратэст супраць прыбыцця ў Мінск новай партыі еўрапейскіх яўрэяў. Ён пісаў аб адсутнасці ўмоў для размяшчэння іх у "горадзе руін" і недахопе харчовага забеспячэння. Камісар выказваў перакананне, што дэпартацыя новай партыі яўрэяў прывядзе да катастрофы ў горадзе, і здымаў з сябе адказнасць за размяшчэнне і харчовае забеспячэнне дэпартаваных яўрэяў.

Цікавымі падаюцца аргументы П.Рэнтрап і ў дачыненні да В.Кубэ, дзейнасць якога як кіраўніка цывільнай адміністрацыі нічым не адрознівалася ад метадаў СС і паліцыі па ліквідацыі яўрэяў і канчатковага вырашэння "яўрэйскага пытання". На думку даследчыцы, сцвярджэнні ў літаратуры аб тым, што генеральны камісар інакш праводзіў агульную лінію, з-за чаго быццам бы ўзнікалі канфлікты са службамі бяспекі і паліцыі, не адпавядаюць рэчаіснасці, паколькі ў аснове напружанасці паміж Кубэ і вышэйзгаданымі службамі ляжалі не прынцыповыя, а ўскосныя моманты, якія не змянялі агульную лінію вырашэння пытання па знішчэнні яўрэяў.

У якасці мадэлі для канчатковага вырашэння "яўрэйскага пытання" кіраўнік Галоўнага ведамства Імперскай бяспекі ў Рэйху Г.Гімлер прапанаваў маштабную праграму па дэпартацыі еўрапейскіх яўрэяў, выкарыстанні іх на прымусовых работах і наступным канчатковым вынішчэнні. Практычна ніхто не выступіў супраць гэтай праграмы. Прадстаўнікі ўсіх ведамстваў адназначна прызналі, што за справу "канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання" нясе адказнасць рэйхсфюрэр СС і шэф германскай паліцыі Г.Гімлер, а таксама мясцовыя начальнікі паліцыі бяспекі і СД. Гэта пазіцыя была замацавана ў рашэннях канферэнцыі ў Берліне—Ванзэе ў студзені 1942 г., пасля якой была распачата падрыхтоўка новых дэпартацый на ўсход. У планах нацысцкага кіраўніцтва Мінск заставаўся месцам для далейшых дэпартацый. Невыпадкова, што адзін з удзельнікаў канферэнцыі Айхман наведаў Мінск у пачатку сакавіка 1942 г. Літаральна праз тыдзень у Мінск прыехаў і рэйхсфюрэр СС Г.Гімлер, які перад гэтым наведаў Магілёў. На думку даследчыцы, пасля размовы




*Мемарыяльная дошка на помніку ахвярам Трасцянецкага лагера смерці.*

Г.Гімлера з В.Кубэ і начальнікам СС Цэнерам атрымалі ўдакладненне планы па дэпартацыі ў Мінск: горад заставаўся месцам вынішчэння да таго часу, пакуль не будуць выкананы раней прынятыя лічбы аб дэпартацыі ў раён беларускай сталіцы 25 тыс. яўрэяў з рэйха. Аднак іх дастаўка з гэтага моманту павінна была ажыццяўляцца не ў Мінскае гета, а за межы горада, дзе яўрэяў адразу пасля прыбыцця павінны былі ліквідаваць (с. 195). З гэтага моманту ўсе пытанні па выкананні "канчатковага рашэння" выходзілі з-пад адказнасці цывільнай адміністрацыі і траплялі ў веданне мінскай паліцыі бяспекі. Гэта азначала, што ўсе наступныя саставы з рэйха будуць накіроўвацца не ў Мінскае гета, а на месца непасрэднай ліквідацыі яўрэяў. У фокус трапляў Малы Трасцянец, які з вясны 1942 г. стаў гаспадаркай камандзіра паліцыі бяспекі і СД у Мінску. Гэтаму рашэнню садзейнічаў той факт, што непадалёк ад месца вынішчэння, якім павінен быў стаць лясны масіў у Благаўшчыне, праходзіла чыгуначная ветка, дзе была створана часовая платформа для выгрузкі дэпартаваных з рэйха яўрэяў. Паводле дакументаў, гэтая ветка была ўпершыню выкарыстана толькі 10 жніўня 1942 г. (с. 198).

Заўважым, што, гаворачы аб стварэнні часовай платформы "побач з Калодзішчамі", аўтар не зусім дакладна лакалізуе месца яе знаходжання. Пра гэта даволі дакладна сказана ў дакуменце Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі "Цэнтр" у Мінску, дзе паказана, што гэтым месцам з'яўляўся 6-ы км на адрэзку Калодзішчы—Міханавічы[9]. Да таго ж, робячы спасылку, даследчыца памылкова ўказвае аркуш 1, тады як інфармацыя змешчана на аркушы 13 дакумента[10]. Кажучы аб дакументах, у адпаведнасці з якімі ўводзіўся графік дэпартацыі еўрапейскіх яўрэяў праз станцыю Калодзішчы непасрэдна ў Малы Трасцянец, даследчыцы неабходна было б звярнуць увагу на тое, што ўсе цягнікі ў гэтым графіку, прынятым на тэрмін з 8 жніўня па 30 кастрычніка 1942 г., атрымлівалі адметную назву: яны называліся *"спецыяльныя цягнікі для перасяленцаў, сезонных рабочых і яўрэяў"*[11].

Разглядаючы трагічныя падзеі, звязаныя з месцам знішчэння ва ўрочышчы Благаўшчына, аўтар згадвае асноўныя этапы дэпартацыі яўрэяў з Еўропы: з 11 мая па 9 кастрычніка 1942 г. у Мінск і Малы Трасцянец прыбылі 16 саставаў з дэпартаванымі яўрэямі, з якіх 9 — з Вены, 5 — з Тэрэзіенштата, і па аднаму з Кёнігсберга і Кёльна. Яўрэі, адпраўленыя першапачаткова ў пасажырскіх вагонах, пачынаючы з Ваўкавыска дастаўляліся да Мінска ці ў Малы Трасцянец у вагонах для перавозкі жывёлы (грузаў. — **С.Н.**). Дастаўка яўрэяў ад часовай платформы каля в. Малы Трасцянец да месца расстрэлу ў Благаўшчыне адбывалася з выкарыстаннем грузавых аўтамабіляў, у тым ліку спецыяльных газавых аўтафургонаў. На думку даследчыцы, пакуль застаецца адкрытым пытанне і аб агульнай колькасці людзей, знішчаных у спецыяльных газавых аўтафургонах у час дастаўкі ва ўрочышча Благаўшчына (с. 208).

Разглядаючы гісторыю Малога Трасцянца, даследчыца адзначае, што такая назва можа выкарыстоўвацца да працоўнага лагера ў гаспадарцы камандзіра мінскай паліцыі бяспекі і СД. Яго стварэнне звязана з вязнямі мінскай турмы, адкуль спачатку былі адабраны каля 20 беларусаў, якія разам з жыхарамі вёскі Малы Трасцянец пачалі будаўнічыя работы на тэрыторыі былога калгаса імя Карла Маркса. У пачатку мая 1942 г. туды была дастаўлена ў якасці рабочай сілы першая група венскіх яўрэяў, і з цягам часу агульная іх колькасць дасягнула амаль 900 чалавек. Сярод іх былі не толькі еўрапейскія, але і беларускія яўрэі. Беларускае насельніцтва таксама выкарыстоўвалася ў якасці рабочай сілы, аднак непрацяглы час. Восенню 1943 г. частка яўрэяў (480 чалавек) разам з 350 вязнямі Мінскага гета была адпраўлена ў канцэнтрацыйны лагер Майданак у Польшчы. На момант нямецкага адступлення летам 1944 г. у лагеры заставаліся 112 яўрэяў і 80 беларусаў, якія былі знішчаны (с. 215).

Пасля стварэння гаспадаркі камандзіра мінскай паліцыі бяспекі і СД на тэрыторыі працоўнага лагера вяліся работы па пабудове жылых і рабочых памяшканняў, дзе адкрываліся розныя майстэрні. Вязні лагера працавалі ад 12 да 15 гадзін у суткі ў сталярнай майстэрні, цэху па вырабу мэблі, кузні, швейнай майстэрні, пральні, майстэрні па вырабу чаравікоў, бандарні, скарняцкай майстэрні. Тых, хто не мог працаваць, забівалі.

За ахову працоўнага лагера Малы Трасцянец адказвалі асобныя падраздзяленні латышскай ахоўнай роты, паліцэйскія фольксдойчэ з Румыніі, Венгрыі і Югаславіі, рота ўкраінскага 23-га ахоўнага батальёна, а таксама адна з рот 11-га ахоўнага батальёна, у якой служылі беларусы (с. 220). Сама тэрыторыя гаспадаркі начальніка мінскай паліцыі бяспекі і СД выкарыстоўвалася і для іншых мэтаў, у тым ліку для размяшчэння савецкіх ваеннапалонных, правядзення заняткаў "школы гестапа". У студзені 1944 г. вёска Малы Трасцянец была абвешчана ахоўнай вёскай — з яе былі выселены мясцовыя жыхары, а на іх месца засялілі мясцовых калабарацыяністаў.

У пачатку 1944 г. непадалёк ад гаспадаркі ва ўрочышчы Шашкоўка быў створаны часовы крэматорый (с. 223). Сярод тых, каго там знішчалі, былі вязні зборнага лагера на вуліцы Шырокай у Мінску, непрацаздольныя жанчыны і малыя дзеці, людзі сталага ўзросту і слабыя. Апрача гэтага, там знішчалася неяўрэйскае насельніцтва, захопленае падчас карных аперацый супраць савецкіх партызан. У сувязі з набліжэннем лініі фронту да сярэдзіны чэрвеня 1944 г. лагер на вуліцы Шырокай быў ліквідаваны. Як адзначаецца ў даследаванні, на той момант у ім знаходзіліся ад 2,5 тыс. да 3 тыс. чалавек. Да 1 тыс. чалавек было знішчана ў крэматорыі з мінскай турмы.

Апошнімі ахвярамі сталі былыя вязні гаспадаркі Малы Трасцянец, якія былі знішчаны ў хляву на тэрыторыі гаспадаркі разам з вязнямі мінскай турмы і зборнага лагера на вуліцы Шырокай. Аднак якая агульная колькасць людзей была знішчана ў апошнія чэрвеньскія дні 1944 г., у даследаванні не да канца высветлена. П.Рэнтрап звяртае ўвагу на тое, што дакладныя звесткі адсутнічаюць у такіх важных дакументах, як протаколы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі СССР аб масавым знішчэнні грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных на тэрыторыі Мінска і яго ваколіц у 1941—1944 гг. і Мінскай абласной камісіі садзейнічання ў рабоце НДзК СССР. На думку даследчыцы, падлікі гэтых камісій былі ў большай ступені адвольнымі, паколькі прымаліся пад пэўным палітычным ціскам. Агульная лічба тых, хто быў знішчаны каля Малога Трасцянца, складае каля 60 тыс. чалавек. У працы адзначана, што ў месцы знішчэння ва ўрочышчы Благаўшчына ахвярамі з'яўляліся галоўным чынам еўрапейскія яўрэі (с. 227). Больш дакладныя падлікі ў дачыненні да ўсіх знішчаных ахвяр на аснове вядомых на цяперашні час дакументаў пакуль падвесці немагчыма. З амаль 23 тыс. дэпартаваных у Мінск і Малы Трасцянец удалося выратавацца ўсяго толькі 75 еўрапейскім яўрэям.

У гэтай сувязі заўважым, што нямецкі гісторык не прывяла новыя матэрыялы, на аснове якіх была б больш відавочнай агульная лічба ахвяр у раёне Малога Трасцянца. Даследчыца проста спасылаецца на лічбу, упершыню ўведзеную Х.Герлахам у канцы 1990-х гг. Апрача таго, супярэчлівым нам падаецца і яе тэзіс аб тым, што ва ўрочышчы Благаўшчына большасць ахвяр складалі дэпартаваныя еўрапейскія яўрэі. Паводле дакументаў, выкарыстаных у даследаванні П.Рэнтрап, колькасць дастаўленых у Мінск і Малы Трасцянец, яўрэяў складала крыху больш за $^{1}/_{3}$ ад прапанаванай агульнай лічбы.

Заўважым, што пры звароце даследчыцы да дакументальнай крыніцы, копія якой была ёю выяўлена ў архіве Мемарыяльнага музея Халакосту ў Вашынгтоне, яна памылкова называе старшыню НДзК СССР "лейтэнантам Мікалаем Бурдэнкам" (с. 226). На наш погляд, размова ідзе пра генерал-лейтэнанта Мікалая Нілавіча Бурдэнку, які ўзначальваў камісію ў Беларусі.

Нягледзячы на асобныя недахопы, новая праца нямецкага гісторыка П.Рэнтрап з'яўляецца важным укладам у даследаванне трагічнай гісторыі Мінскага гета і Малога Трасцянца. Несумненнай заслугай даследчыцы можна лічыць удалую спробу па глыбокаму навуковаму асэнсаванню пакуль малавядомых і неадназначных падзей гісторыі не толькі беларускага, але і яўрэйскага народаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Новая праца чакае айчыннага чытача пры ўмове яе перакладу на беларускую мову і прэзентацыі перад шырокай аўдыторыяй з удзелам не толькі навукоўцаў, але ў першую чаргу тых, хто меў непасрэднае дачыненне да гэтай жахлівай старонкі нашай гісторыі.

[1] Трагедия евреев Белоруссии в годы немецкой оккупации (1941—1944): Сборник материалов и документов / Отв. ред. Р.А. Черноглазова. Мн., 1995; Judenfrei! Свободно от евреев: История минского гетто в документах / Авт.-сост. Р.А.Черноглазова. Мн., 1999; Иоффе Э.Г. Иностранные евреи в Тростенецком лагере смерти / Под ред. М.И.Богдана. Мн., 2000; Холокост в Беларуси. 1941—1944. Документы и материалы / Сост.: И.Г.Иоффе, Г.Д.Кнатько, В.Д.Селеменев. Мн., 2002; Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы / Сост. В.И.Адамушко, Г.Д.Кнатько, Н.Е.Колесник, В.Д.Селеменев, Н.А.Яцкевич. Мн., 2003; Генацыд у Другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца): матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. 25—27 красавіка 2002 г., Мінск / Адк. рэд. К.І.Козак, А.М.Літвін, У.Н.Сідарцоў. Мн., 2003; Лагер смерці Трасцянец 1941—1944 гг.: памяці ахвяр нацызму ў Беларусі. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі 10 лістапада 2004 г., Мінск / Адк. рэд. В.Ф.Балакіраў, К.І.Козак. Мн., 2005; Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации. Сборник научных работ / Сост. и ред. Я.З.Басин. Мн., 2005; Хеккер К. Немецкие евреи в Минском гетто / Отв. ред. К.И.Козак. Пер. с нем. Г.А.Скакун. Мн., 2007; Тукала С.М. Дэпартацыя яўрэяў краін Заходняй Еўропы ў Мінскае гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 3. 2007, № 1. С. 26—30; Ён жа. Ліквідацыя Мінскага гета: асаблівасці, этапы, наступствы // Веснік Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна. Серыя гуманітарных і грамадскіх навук. 2007, № 3. С. 50—55; Ён жа. Правядзенне пагромаў у Мінскім гета // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 12 мая 2006 г. / рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. Вып. 5. Мн., 2007. С. 153—157.

[2] Тукала С.М. Генацыд і барацьба яўрэяў у Мінскім гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ліпень 1941—кастрычнік 1943 года): аўтарэф. дыс... канд. гіст. навук. Мн., 2008; Тукала С.М. Генацыд і барацьба яўрэяў у Мінскім гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ліпень 1941—кастрычнік 1943 года): аўтарэф. дыс... канд. гіст. навук. Мн., 2010.

[3] Гісторыя Мінска. Мн., 2006. С. 375—381.

[4] Трасцянецкі лагер смерці // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 1. Мн., 2001. С. 518—519.

[5] Rentrop P. Tatorte der "Endlösung". Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostenez. Berlin, 2011. — 256 s.

[6] Дневник из Минского гетто (ноябрь 1941—июнь 1942 г.) // Беларусь у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны: масавыя забойствы нацыстаў. Мн., 2005. С. 202—225.

[7] Пашпарт горада Мінска // Звязда. 1941, 5 студзеня. С. 4.

[8] Rentrop P. Tatorte der "Endlösung". Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostenez. S. 113.

[9] Карта Генерального штаба Красной Армии №№ 35—80 (Минск), 1933 г. / Приложение // Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. Мн., 2003.

[10] НА РБ. Ф. 378, воп. 1, спр. 508, арк. 13.

[11] Там жа. Арк. 28.